# ДЫПЛОМЫ АТРЫМАЛІ МУЗЕЙШЧЫКІ

Выпускнікі гістарычнага факультэта спецыяльнасці «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны», сярод якіх і грамадзяне Туркменістана, 22 студзеня атрымалі доўгачаканыя дыпломы і першага сакавіка бягучага года прыступяць да працы.

Першымі іх працоўнымі месцамі стануць музеі Віцебскай, Мінскай, Магілёўскай абласцей. Маладыя спецыялісты будуць прымяняць веды, якія назапасілі ва ўніверсітэце падчас вучобы і вытворчых практык у турыстычных фірмах і турыстычна-гасцінічных комплексах. Некаторыя з выпускнікоў мяркуюць прадоўжыць вучобу ў магістратуры.

**УЛАСНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ.**